Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

*Установа адукацыі*
«Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка»

Гістарычны факультэт

# ПАЛІТЫЧНЫЯ, САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНЫЯ І ЭТНАКУЛЬТУРНЫЯ ПРАЦЭСЫ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ Ў XIX – ПАЧАТКУ XX СТ.

## ДА 150-ГОДДЗЯ СКАСАВАННЯ ПРЫГОННАГА ПРАВА Ў РАСІЙСКАЙ ІМПЕРЫІ

*Матэрыялы Рэспубліканскай навукова-тэарэтычнай канферэнцыі*
г. Мінск, 4 сакавіка 2011 г.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Мінск 2011

# РАСПРАЦОЎКА І ПРАВЯДЗЕННЕ ІНВЕНТАРНАЙ РЭФОРМЫ Ў БЕЛАРУСІ (40–50-я гг. XIX ст.)

***Рацько А.Ф., дацэнт, БДПУ, г. Мінск***

У часы царавання Мікалая І не спыняліся хваляванні сялян, прыдушаных прыгонным правам. Самадзяржаўе неаднаразова рабіла спробы вырашыць сялянскае пытанне заканадаўча, паслабіўшы залежнасць сялян ад памешчыка з узмацненнем урадавай апекі над жыццём вёскі. Аднак дробныя, паліятыўныя меры, іншы раз паўтараючыя старыя, забытыя законы, прызваныя толькі некалькі рэгламентаваць прыгоннае права, звычайна насілі рэкамендуючы характар і не вырашалі праблему прыгоннага права. Мікалаеўскі ўрад стварыў 10 сакрэтных камітэтаў, у якіх буйныя чыноўнікі і прыгоннікі келейна абмяркоўвалі сялянскае пытанне. Пэўны след у гісторыі пакінулі два з іх – камітэты 1835 і 1839 гг.

Сакрэтны камітэт 1835 г. распрацаваў праграму «двуадзінай рэформы», якая павінна была ахапіць як казённую, так і памешчыцкую вёску, нівеліраваць становішча прыватнаўласніцкіх і казённых сялян пры захаванні іх феадальнай эксплуатацыі. Камітэт распрацаваў этапы пераводу сялян «ад стану прыгоннага да стану свабоды», у выніку чаго працэс вызвалення расцягваўся на няпэўны час і павінен быў завяршыцца беззямельным вызваленнем [3, с. 280–298]. Гэта было не рашэнне сялянскага пытання, а імкненне зацягнуць яго. Работа сакрэтнага камітэта 1835 г. скончылася безвынікова.

У 1839 г. быў створаны новы сакрэтны камітэт, у якім вялікую ролю адыгрываў П.Дз. Кісялёў – адукаваны і ліберальны для свайго часу чалавек, якога Мікалай І называў сваім «начальнікам штаба па сялянскай частцы». З пункту гледжання Кісялёва памешчыкі павінны былі захавыць вотчыннае права ўласнасці на ўсю зямлю, сяляне – атрымаць уласную свабоду і права карыстацца памешчыцкай зямлёй за натуральныя і грашовыя



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

павіннасці. Дзяржава павінна была выступіць у якасці вярхоўнай рэгулюючай сілы, абмяжоўваючы свавольства зямельнага ўласніка, але абараняючы яго права на атрыманне даходу. Кісялёў лічыў магчымым вырашыць сялянскае пытанне шляхам урадавай рэгламентацыі ўзаемаадносін паміж памешчыкамі і сялянамі, увядзення ў прыватнаўласніцкай вёсцы абавязковых інвентароў. Імкнучыся захаваць дваранскае землеўладанне і разам з тым лічачы немагчымым вызваленне сялян без зямлі, Кісялёў прапанаваў, каб памешчыкі пры іх вызваленні, застаючыся ўласнікамі зямлі, абавязкова надзялялі сялян пэўным надзелам (які яны ўжо не маглі забраць) за выкуп і дакладна зафіксаваныя павіннасці (ад якіх сяляне не маглі адмовіцца амаль да поўнага выкупу). Абавязковасць гэтага закона выклікала пратэст з боку рэакцыйных членаў камітэта. Вынікам работы гэтага камітэта стаў указ ад 2 красавіка 1842 г. аб «абавязаных сялянах», дзе не было ніякага намёку на першапачатковыя ідэі – інвентарызацыю памешчыцкіх маёнткаў, прадастаўленне сялянам права ўласнай свабоды і частковага падпарадкавання памешчыцкіх сялян упраўленню дзяржаўных маёмасцей [3, с. 611–627].

У заходніх губернях, дзе пасля падаўлення паўстання 1830–1831 гг. сялянскае пытанне набыло не толькі вострае сацыяльна-эканамічнае, але і асоба палітычнае значэнне, царызм дзейнічаў больш рашуча, імкнучыся ізаляваць тут польскі нацыянальна-вызваленчы рух ад народных мас і ўмацаваць палітычныя і сацыяльныя пазіцыі самадзяржаўя. Ва ўрадавых колах лічылася, што становішча сялян у заходніх губернях было намнога складаней (у асаблівасці ў беларускіх губернях), чым сялян цэнтра Расіі. Азнаёміўшыся са справаздачай віцебскага губернатара П.П. Львова за 1839 г. аб стане Віцебскай губерні, дзе гаварылася аб празмерных падатках сялян на карысць памешчыкаў, Кісялёў прапанаваў увесці абавязковыя інвентары, якія б абаранялі прыгонных ад канчатковага разарэння [5, с. 46]. Камітэт па справах заходніх губерняў з сакавіка 1840 г. пачаў займацца выпрацоўкай умоў інвентарнай рэформы. Міністэрства ўнутраных спраў патрабуе ад віленскага генерал-губернатара П.А. Далгарукава меркаванняў аб становішчы памешчыцкіх маёнткаў і сродках да іх лепшага ўладкавання. На запыт генерал-губернатара толькі гродзенскі губернатар Г.Г. Дапельмаер і правіцель Беластокскай вобласці Гаранопула выказаліся прама за ўвод інвентароў. А вось іншыя, у тым ліку мінскі губернатар М.В. Сушкоў і сам Далгарукаў, выказвалі сумненне адносна гэтага мерапрыемства ўрада. Таксама і новы віленскі генерал-губернатар Ф. Я. Міркавіч, прызначаны на гэтую пасаду ў 1840 г., не быў перакананы ў неабходнасці ўвядзення ў краі інвентароў. Затое Мікалай І прытрымліваўся іншага пункту гледжання. На часопісе Камітэта па справах заходніх губерняў ён напісаў: «Са справай гэтай не марудзіць, я лічу яе вельмі важнай і чакаю ад гэтай справы вялікай карысці» [4, с. 22].

15 красавіка 1844 г. Мікалай І зацвердзіў «Палажэнне», згодна з якім у губернях засноўваліся «Камітэты для разгляду і складання інвентароў памешчыцкім маёнткам у заходніх губернях» [2, с. 336]. У тым жа годзе камітэты былі створаны ва ўсіх беларускіх губернях. У камітэты ўваходзілі царскія чыноўнікі і прадстаўнікі дваранства. Існуючыя інвентары павінны былі зацвярджацца ў тым выглядзе, у якім яны былі прадстаўлены памешчыкамі, а калі інвентароў не было, то складаліся новыя, якія фіксавалі павіннасці сялян на час складання дакумента. Інвентары зацвярджаліся генерал-губернатарамі на тэрмін да 6 гадоў, на працягу якіх меркавалася выпрацаваць новыя, канчатковыя правілы. І хаця памешчыкі запэўніваліся, што іх правы ні ў якім разе не будуць парушаны, сутнасць усяго мерапрыемства заключалася ў тым, што інвентары, быўшыя раней прыватнымі і неабавязковымі дакументамі, уводзіліся ва ўсіх памешчыцкіх маёнтках і павіннасці з сялян можна было патрабаваць толькі тыя, якія былі запісаны ў інвентары.

У адпаведнасці з «Правіламі для кіраўніцтва для складання інвентароў», якія складалі асноўную частку «Палажэння « ад 15 красавіка 1844 г. прадугледжвалася падзяленне сялян на цяглавых, агароднікаў і бабылёў. Памешчыкі мелі права па сваім меркаванні надзяляць сялян зямлёй. Натуральныя павіннасці вызначаліся ў адпаведнасці з колькасцю і якасцю адведзеных сялянам зямельных участкаў. Памеры галоўных павіннасцей (паншчына, аброк, згоны) залежылі ад велічыні зямельнага ўчастка, яго якасці і не павінны былі перавышаць 1/3 валавога дахода з надзела. Дадатковыя ж павіннасці (шарваркі, падарожчына, старажоўшчына, даніны) адбываліся як плата за дадатковыя выгоды, дадзеныя для сялян уладальнікам [1, с. 488].

Пасля выдання агульных інвентарных правіл для заходніх губерняў (1844 г.), калі пачасціліся чуткі аб вызваленні сялян ад прыгоннай залежнасці, памешчыкі абеззямельвалі іх, а адабраныя землі прысвойвалі сабе і здавалі ў арэнду. Абеззямельванне сялян аблягчалася тым, што ў названых правілах і ў правілах



губернскіх інвентарных камітэтаў беларускіх і літоўскіх губерняў нічога не гаварылася пра неадчужальнасць сялянскіх надзелаў. Інвентарныя камітэты, якія зацвярджалі інвентары прыватнаўласніцкіх маёнткаў, абаранялі інтарэсы памешчыкаў. Так, напрыклад, інвентарны камітэт Мінскай губерні вызначыў, што памешчык мае права перасяляць на панскі двор сялян са шматсямейных двароў. Адны з іх маглі быць пераведзены туды ў якасці дваровых слуг, другія – парабкаў. У абодвух выпадках селяніна пазбаўлялі надзела, які далучалі да панскай ворнай зямлі [7, с. 55–56].

Пад уплывам сялянскага руху ў памешчыцкай вёсцы ўрад вымушаны быў паставіць пытанне аб пераглядзе інвентарнага «Палажэння» 15 красавіка 1844 г. Ініцыятыву ў гэтым узяў на сябе кіеўскі генерал-губернатар Дз.Г. Бібікаў. Па яго загадзе быў складзены «агульны інвентар», у якім намячаліся аднолькавыя павіннасці. У 1848 г. на тэрыторыі Правабярэжнай Украіны (Кіеўская, Валынская і Падольская губерні) былі ўведзены новыя інвентарныя «Правілы», па якіх уся зямля, што знаходзілася ў карыстанні сялян, заставалася за імі. У адрозненне ад Правабярэжнай Украіны, у Беларусі і Літве ў кожным маёнтку складаўся свой інвентар. Памешчыкі вельмі неахвотна дасылалі ў інвентарныя камітэты інвентары ўласных маёнткаў. Увядзенне абавязковых інвентароў на тэрыторыі Гродзенскай і Мінскай губерняў пачалося вясной 1847 г., суправаджалася іх масавым пераглядам і працягвалася болей чатырох гадоў (1847–1850) [6, с. 172–173].

Вельмі цяжка ішло ўвядзенне інвентарных правіл у Віцебскай і Магілёўскай губернях. Мясцовыя памешчыкі лічылі, што ўвядзенне абавязковых інвентароў прывядзе да памяншэння іх прыбыткаў. Яны патрабавалі захавання трохдзённай паншчыны на тыдзень з рабочай душы, спасыläліся на адсутнасць планаў межавання земель, даных аб ураджайнасці на сялянскіх участках. І хаця к 1849 г. інвентары па ўсіх маёнтках азначаных губерняў былі складзены, царскі ўрад не рашыўся ўвесці іх у дзеянне з-за значнага перавышэння ў гэтых дакументах фактычна існуючых павіннасцей і баязні сялянскіх хваляванняў.

Павелічэнне павіннасцей, нарастаючае абеззямельванне сялян заходніх губерняў выклікалі з боку прыгонных рэзкія пратэсты і паслужылі галоўнай прычынай узмацнення сялянскага руху. 22 снежня 1852 г. Мікалай І зацвердзіў новыя інвентарныя правілы, якія прадугледжвалі больш сур'ёзныя абмежаванні ў адносінах правоў памешчыкаў на надзельныя сялянскія землі. Асноўным палажэннем гэтых правіл была неадчужальнасць сялянскай зямлі. Акрамя таго, была ўстаноўлена плата за згонныя дні і некалькі паменшана паншчына. Правілы 1852 г. павінны былі зачытывацца ва ўсіх маёнтках, і памешчыкаў абавязвалі даваць падпіску, што яны не будуць іх парушаць [8, с. 50].

Аднак новыя правілы выклікалі абурэнне памешчыкаў, якія ўвогуле выступалі супроць умяшання дзяржавы ва ўнутрыпамеснае размеркаванне ўгоддзяў і рэгламентацыю сялянскіх павіннасцей. У красавіку 1854 г. Мікалай І перадаў «Правілы» 22 снежня 1852 г. на разгляд новага сакрэтнага камітэта, старшынёй якога быў прызначаны наследнік прастола, Аляксандр ІІ. Будучы «вызваліцель» быў супроць любых абмежаванняў праў памешчыкаў у адносінах распараджэння зямлёю. Сакрэтны камітэт прапанаваў губернскім інвентарным камітэтам перагледзець інвентарныя «Правілы» 1852 г., і ўжо праз некалькі месяцаў віленскаму генерал-губернатару І.Г. Бібікаву былі перададзены новыя варыянты інвентарных правілаў. У адрозненне ад іншых, Гродзенскі інвентарны камітэт катэгарычна адмовіўся прызнаваць права сялян на якую-небудзь зямлю, а ў заключнай частцы дакумента прапаноўвалася ліквідаваць прыгоннае права ўвогуле. Сялянам давалася права свабоднага перамяшчэння ў межах губерні [9, с. 455–456]. Фактычна гродзенскі праект адмяняў не прыгоннае права, а рабаўладальніцкае права памешчыкаў і адначасова пазбаўляў сялян усіх правоў на зямлю. Генерал-губернатар адхіліў праект Гродзенскага камітэта і распрацаваў свой, у якім былі скасаваны ўсе ўступкі сялянам, што прадугледжваліся «Правіламі» 1852 г.

Перагледжаныя ў губернскіх камітэтах інвентары паступілі на разгляд вышэйшых інстанцый і ў выніку былі перададзены на абмеркаванне Агульнага схода Дзяржаўнага савета ў маі 1855 г. Паводле новых правіл паншчына з цягла вызначалася ў памеры 3 дзён мужчынскай і столькі ж жаночай працы ў тыдзень. У залік паншчыны выконвалася падворная павіннасць. Іншыя дадатковыя работы, згоны, натуральныя паборы скасоўваліся. Зямля заставалася недатыкальнай уласнасцю памешчыка, але ён абавязаны быў аддаць у карыстанне селяніна не менш як 3,75 дзесяціны прыдатнай зямлі на рэвізскую душу. Калі надзел перавышаў 9 дзесяцін, памешчык мог яго зменшыць [1, с. 489]. У выніку болей чым чатырохгадовай барацьбы вакол правіл і ў першую чаргу вакол пытання аб неадчужальнасці сялянскай зямлі перамаглі крайнія прыгоннікі: за



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

